МІНСКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**РАШЭННЕ** **РЕШЕНИЕ**

18 мая 2022 г. № 415

г. Мінск г. Минск

Аб наданні статусу і катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці

На падставе падпункта 1.1 пункта 1, пункта 7 артыкула 93 і падпункта 4.1 пункта 4 артыкула 96 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, рашэння Мінскага абласнога савета па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны ад 7 красавіка 2022 г. (пратакол № 2) Мінскі абласны выканаўчы камітэт ВЫРАШЫЎ:

1. Надаць нерухомай матэрыяльнай культурнай каштоўнасці – сядзібнаму дому Бонч-Асмалоўскіх (датаванне каштоўнасці – 1895 год), размешчанаму па адрасе: Мінская вобласць, Пухавіцкі раён, аг. Блонь, вул. Санаторная, 5 (інв. № 602/С-43486), статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыю «3».

2. Пухавіцкаму раённаму выканаўчаму камітэту ў месячны тэрмін арганізаваць падпісанне ахоўнага абавязацельства і забяспечыць падрыхтоўку пашпарта на дадзеную гісторыка-культурную каштоўнасць.

3. Кантроль за выкананнем дадзенага рашэння ўскласці на намесніка старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Маркевіча І.С.

Старшыня А.Г.Турчын

Кіраўнік спраў У.А.Гурыновіч

МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
УПРАВЛЕНИЕ ДЕЛАМИ